ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 32 (632) | Субота 29 лістапада 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*На педагагічную працу—датэрмінова*

## ВЫПРАБАВАННЕ НА ГАРТ

Звычайна цёплыя словы на дарогу гавораць выпускнікам ВНУ пасля ўручэння ім дыпломаў аб вышэйшай адукацыі. Кожную вясну новаму атраду маладых спецыялістаў жадаюць поспехаў, здзяйсненняў у самастойным працоўным жыцці, выказваюць надзею на тое, што выпускнікі, дзе б яны ні працавалі, будуць апраўдваць ускладзеныя на іх спадзяванні.

Такі ж урачысты момант уручэння дыпломаў у пяці чацвёртакурснікаў факультэта фізічнага выхавання ГДУ яшчэ наперадзе. А вось словы пажадання поспехаў у выкладчыцкай працы ім былі сказаны рэктарам ГДУ акадэмікам АН БССР Б. В. Бокуцем, сакратаром камітэта камсамола універсітэта А. Дземідзенкам, дэканам факультэта фізвыхавання Б. М. Зайцавым у гэтыя дні. І цяпер прывычны рытм студэнцкіх будняў гэтых юнакоў і дзяўчат зменіць педагагічная праца ў сельскіх школах вобласці, у якіх, у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС, узнікла складаная абстаноўка з кадрамі настаўнікаў. Іх дадатковая колькасць спатрэбілася з пераводам некаторых школ на рэжым поўнага дня. Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР звярнулася да ВНУ рэспублікі, якія рыхтуюць педагогаў, з просьбай даўкамплектаваць сельскія школы выпускнікамі бягучага навучальнага года.

Разумеючы складанасць становішча з кадрамі настаўнікаў, на гэту просьбу адгукнуліся і ў ГДУ. Выказалі жаданне паехаць працаваць у сельскія школы Хойніцкага, Добрушскага, Лоеўскага, Кармянскага раёнаў лепшыя студэнты факультэта фізвыхавання — актывісты камсамольскага і грамадскага жыцця універсітэта, факультэта Антон Яноўскі, Анатоль Міхнавец, Аляксандр Закаўраш, Ірына Калінава, Алена Канаменава.

Юнакі і дзяўчаты разумелі, што давядзецца нялёгка: і весці заняткі ў школах, і працягваць вучобу ва універсітэце — самастойна засвойваць вучэбную праграму па індывідуальнаму плану, спецыяльна для іх распрацаванаму ў дэканаце, здаваць залікі і экзамены, пісаць дыпломныя работы.

— Але ў цяжкасцях, экстрэмальных сітуацыях і выпрацоўваецца сапраўдны характар, — выказаў думку ўсіх рабят Аляксандр Закаўраш.

Маладыя спецыялісты (называць іх так ужо ёсць падставы) будуць трымаць цесную сувязь з факультэтам, камітэтам камсамола універсітэта, дзе пры неабходнасці ім заўсёды прыйдуць на дапамогу.

...Зонай асаблівай увагі называюць цяпер раёны, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, а таксама тыя, што прынялі перасяленцаў. Але гэта яшчэ і месца, дзе праходзяць выпрабаванне на прафесіянальную годнасць, правяраючца на гарт характары студэнцкай моладзі.

Т. ДУБЯК.



**На здымку: (злева направа) А. Яноўскі, А. Канаменава, А. Міхнавец, І. Калінава і А. Закаўраш разам з дэканам факультэта фізвыхавання дацэнтам Б. М. Зайцавым перад ад'ездам на самастойную педагагічную працу ў сельскія школы вобласці.**

Фота У. Чысціка.

*30-га ЛІСТАПАДА — ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ БЕНІН*

## ЧАС САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕРАМЕН

Мая радзіма знаходзіцца на заходнім узбярэжжы Афрыкі і мае граніцы з Нігерыяй, Рэспублікай Нігер, Тога і Буркіна-Фасо. З поўдня Бенін амываюць воды Атлантычнага акіяна. Тэрыторыя Беніна складае 112,6 тысяч км², насельніцтва — 3,6 мільёна чалавек. Нашу дзяржаву насяляюць прадстаўнікі розных нацыянальнасцей — фон, аджа, барыба, дэндзі, йоруба, сомба і іншыя. Сталіца Беніна — горад Порта-Нова, дзяржаўная мова — французская.

На працягу доўгага часу Бенін быў французскай калоніяй. Сваю незалежнасць ён набыў у 1960 годзе, калі на афрыканскім кантыненце адбываліся грандыёзныя палітычныя пераўтварэнні. У ліку тых краін, што скінулі ланцугі каланіяльнага прыгнёту, была і Рэспублікі Дагамея, якая ў лістападзе 1975 года была перайменавана ў Народную Рэспубліку Бенін.

Важнай вяхой у жыцці маладой краіны стала ўзнікненне рэвалюцыйнага руху нацыянальнага вызвалення 26 кастрычніка 1972 года. Гэты дзень, а таксама 30 лістапада — дзень нацыянальнага свята — ўвасквашае ў сэрцы кожнага бенінца слаўныя ўспаміны. 30 лістапада ўрад краіны выступіў з праграмай, у якой абвяшчалася новая палітыка нацыянальнай незалежнасці і прагрэсіўных пераўтварэнняў. Тады ж быў аб'яўлены курс на развіццё краіны па шляху сацыялістычнай арыентацыі.

30 лістапада 1975 года абвешчана Народная Рэспубліка Бенін і было аб'яўлена аб утварэнні Партыі народнай рэвалюцыі Беніна на чале з таварышам Мацье Керэку. Бенінская дзяржава праводзіць палітыку паступовага абагульнення важнейшых сродкаў вытворчасці, пашырэння дзяржаўнага сектара. Ажыццяўляецца школьная рэформа, мэта якой — не толькі зрабіць Бенін краінай суцэльнай пісьменнасці, але і радыкальна перабудаваць усю сістэму адукацыі, наблізіць яе да патрабаванняў нацыянальнага развіцця.

За 14 год, якія прайшлі пасля рэвалюцыі, у нашай краіне дасягнуты немалыя поспехі. Але многія праблемы засталіся нявырашанымі. II з'езд Партыі народнай рэвалюцыі Беніна, які адбыўся ў лістападзе 1985 года, пацвердзіў нязменнасць курса на пабудову ў перспектыве сацыялістычнага грамадства ў краіне.

Гэтымі днямі ў Савецкім Саюзе з афіцыйным дружалюбным візітам знаходзіўся Старшыня ЦК Партыі народнай рэвалюцыі Беніна, Прэзідэнт і кіраўнік урада Народнай Рэспублікі Бенін Мацье Керэку. У ходзе візіту адбыліся яго сустрэчы і перагаворы з Генеральным сакратаром ЦК КПСС М. С. Гарбачовым і Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР А. А. Грамыкам. Гэты візіт яшчэ больш умацуе дружбу і супрацоўніцтва паміж народамі СССР і Народнай Рэспублікай Бенін.

**Фелікс КАФІ**
**(Народная Рэспубліка Бенін), студэнт 2-га курса матэматычнага факультэта.**

*АБ'ЯЎЛЯЕЦЦА КОНКУРС*

## НА ЛЕПШЫЯ НАВУКОВЫЯ РАБОТЫ

З мэтай далейшага развіцця фундаментальных і прыкладных даследаванняў, больш поўнага выкарыстання навуковага патэнцыялу вышэйшай школы для рашэння навукова-тэхнічных і сацыяльна-эканамічных задач дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва перыядычна (адзін раз у два гады) Мінвуз СССР праводзіць конкурс на лепшыя навуковыя даследчыя работы, выкананыя ў вышэйшых навучальных установах краіны.

У 1988 годзе будзе праводзіцца чарговы конкурс на лепшыя навуковыя работы, завершаныя ў ВНУ ў перыяд з 1985 па 1987 г.г.

На конкурс прадстаўляюцца:

— асобныя навукова-даследчыя работы або цыкл НДР па актуальных праблемах грамадскіх, прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навук, якія маюць вялікае народнагаспадарчае, навуковае і сацыяльна-эканамічнае значэнне і завершаныя на працягу трох гадоў, папярэднічаючых году правядзення конкурсу.

Для заахвочвання аўтараў лепшых навуковых работ устаноўлена да 10 першых прэмій па 2000 руб., да 20 — другіх па 1000 руб. і да 50 — трэціх па 500 руб. кожная.

Да кожнай прадстаўленай на конкурс работы прыкладаюцца наступныя матэрыялы (у 2-х экземплярах):

— пісьмо-прадстаўленне рэктара;

— рашэнне Савета ВНУ аб прадстаўленні работы на конкурс;

— спіс аўтараў з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, вучонай ступені і звання, займаемай у ВНУ пасады;

— даведка аб асабістым укладзе кожнага сааўтара ў выкананне прадстаўленай на конкурс работы;

— анатацыі работы ў аб'ёме да трох старонак машынапіснага тэксту;

— водзывы, рэцэнзіі, акты аб укараненні (для навуковых работ);

— спіс публікацый (для навуковых работ);

— копіі дыпломаў, аўтарскіх пасведчанняў, патэнтаў, узнагарод і іншых дакументаў, якія адлюстроўваюць грамадскае прызнанне работы (для навуковых работ);

— даведка аб выкарыстанні вынікаў навукова-даследчай работы ў народнай гаспадарцы і ў вучэбным працэсе (для навуковых работ);

— учотная картка па ўстаноўленай форме;

— звесткі аб аўтарах па ўстаноўленай форме.

Прадстаўляемыя на конкурс работы павінны прайсці абавязковую дзяржаўную рэгістрацыю ва Усесаюзным навукова-тэхнічным інфармацыйным цэнтры (акрамя падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў).

В. СКРЭЖЭНДЗЕЎСКАЯ,
ст. інжынер службы НТІ ГДУ.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**5 снежня 1986 г. у 14.30 у актавай зале ГДУ адбудзецца V справаздачна-выбарная канферэнцыя арганізацыі таварыства «Веды».**

**ПАРАДАК ДНЯ:**

1. Справаздачны даклад праўлення.
2. Справаздача рэвізійнай камісіі.
3. Выбары новага саставу праўлення.
4. Выбары рэўкамісіі.

**ПРАЎЛЕННЕ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ» ГДУ.**

*Курс — паскарэнне*

# ПРАДУКЦЫЙНА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ МАТЭРЫЯЛЬНУЮ БАЗУ НАВУКІ

Кафедры і навуковыя падраздзяленні нашага універсітэта актыўна ўключыліся ў распрацоўку зададзеных агульнасаюзных, рэспубліканскіх і галіновых навукова-тэхнічных праграм, а таксама праграм па вырашэнню важнейшых праблем у галіне прыродазнаўчых і грамадскіх навук. Выканаўца тэматыкі па асобных пастановах урада краіны, уключаная ў планы Дзяржкамітэта СССР па навуцы і тэхніцы, у планы Акадэміі навук БССР і галіновых міністэрстваў. Ёсць падставы гаварыць, што вучоныя ГДУ здолелі заявіць аб сабе як аб унушальнай навуковай сіле.

Разам з тым нельга сказаць, што вынікі ўсёй навуковай дзейнасці нашага універсітэта ў поўнай меры адпавядаюць сучасным патрабаванням. Наяўныя недахопы нам добра вядомы. Цяпер трэба без прамаруджвання актывізаваць намаганні ўсіх падраздзяленняў для павышэння эфектыўнасці навукі. Настаў час рашуча перабудоўваць і арганізацыйную работу, не дапускаць фактаў скажэння сапраўднага становішча спраў, што перашкаджае выпрацоўцы правільных рашэнняў і ацэнак.

Адна з асноўных умоў павышэння эфектыўнасці навуковых даследаванняў — развіццё і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, пераход да новых, прагрэсіўных метадаў даследаванняў на аснове аўтаматызацыі з прымяненнем навейшых сродкаў вылічальнай тэхнікі. Мы абавязаны павышаць фондааддачу асноўных сродкаў, што патрабуе больш поўнага іх выкарыстання, асабліва каштоўных установак, прыбораў, вылічальнай тэхнікі шляхам прымянення розных форм калектыўнага іх выкарыстання. Работа гэта клапатлівая, патрабуе ад кіраўнікоў падраздзяленняў і саміх навукова-педагагічных работнікаў паўсядзённых намаганняў. Пры камплектаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы навукі неабходна паслядоўна прытрымлівацца прынцыпу: не набываць і не браць на баланс абсталяванне ўстарэлае, а тым больш — няспраўнае. На жаль, гэты прынцып у нас нярэдка парушаецца. Тут у многім віна кладзецца на пастаянна дзеючую камісію па кантролю за рацыянальным выкарыстаннем каштоўнага абсталявання, якую ўзначальвае прарэктар па навуковай рабоце прафесар М. В. Навучыцель. Яна заклікана трымаць пад пастаянным наглядам увесь працэс фарміравання матэрыяльна-тэхнічнай базы, яе стан і рацыянальнае выкарыстанне. Іменна пад яе кіраўніцтвам распрацаваны дакументы, якія рэгламентуюць дзейнасць падраздзяленняў універсітэта па закранутых пытаннях.

Цяпер мы павінны прызнаць, што дзейнасць камісіі не заўсёды была сістэмнай і паслядоўнай.

Наглядным прыкладам, ілюструючым сказанае, сталі вынікі праверкі стану матэрыяльна-тэхнічнай базы праблемнай навукова-даследчай лабараторыі фізіка-хімічных працэсаў трэння і кафедры агульнай фізікі. У названай лабараторыі (аддзел фізіка-хімічных працэсаў трэння) з 29 адзінак каштоўнага абсталявання (звыш тысячы руб. кожная) у рабочым стане знаходзіліся 16. Астатнія былі няспраўнымі. Між тым у справаздачы, падпісанай загадчыкам ПНДЛ М. І. Ягоранкавым і матэрыяльна-адказнай асобай старшым інжынерам П. В. Атрошчанкам, значылася толькі адна адзінка няспраўнага абсталявання.

І яшчэ. З 13 няспраўных і невыкарыстоўваемых адзінак абсталявання шэсць — гэта ўстаноўкі ЦКБ-50. Яны былі атрыманы з Гомельскага політэхнічнага інстытута па ініцыятыве былога дэкана фізічнага факультэта У. М. Старыкава. Ён ведаў аб тэхнічным стане гэтых установак і як член пастаяннай камісіі па рацыянальнаму выкарыстанню абсталявання не павінен быў допусціць іх набыцця. Але, як ні дзіўна, Уладзімір Мікалаевіч запэўніў камісію і кіраўніцтва універсітэта аб спраўнасці і абавязковым выкарыстанні названых установак для навуковых даследаванняў. У выніку імі заняты значныя вытворчыя плошчы, а карысці — ніякай.

На кафедры агульнай фізікі таксама выяўлена скажэнне справаздачных даных. Тут ёсць дзве адзінкі няспраўнага каштоўнага абсталявання, якое, натуральна, не выкарыстоўваецца. Аднак у справаздачных даных, якія падпісаны загадчыкам кафедры Д. Р. Лінам і загадчыкам лабараторыі М. Л. Бурыкіным, гэтыя ўстаноўкі значацца як законсерваваныя. Гэта значыць, што яны нібыта спраўныя, але часова не выкарыстоўваюцца. На той жа кафедры з 10 рабочых сродкаў вымярэнняў у графік праверкі ўключана толькі 2.

Прыведзеныя факты, выяўленыя камісіяй, сталі прадметам сур'ёзнага абмеркавання на пасяджэнні рэктарата 27 кастрычніка г. г. Ад усіх віноўных у дапушчаным ненармальным становішчы выкарыстання тэхнічнай базы запатрабавалі пісьмовыя тлумачэнні. Ва ўстаноўлены тэрмін іх прадставілі толькі П. В. Атрошчанка, М. І. Ягоранкаў, М. Л. Бурыкін. Некалькі пазней даў яго У. М. Старыкаў. А вось Д. Р. Лін праігнараваў патрабаванне рэктарата.

Аднак, як ні дзіўна, і з пісьмовых тлумачэнняў не бачна, што факты скажэння справаздачных даных аб стане выкарыстання абсталявання кіраўнікамі падраздзяленняў правільна ацэнены і асуджаны. Ніхто з адказных асоб не ўказаў на плануемыя меры па ліквідацыі ўскрытых камісіяй недахопаў. Таму рэктарат быў вымушаны прыняць да віноўных меры адміністрацыйнага ўздзеяння ў мэтах папярэджання і недапушчэння аналагічных фактаў. У загадзе ад 20 лістапада дэканам факультэтаў, загадчыкам кафедр і кіраўнікам іншых падраздзяленняў, якія маюць у сваім распараджэнні каштоўнае навуковае абсталяванне і рабочыя сродкі вымярэнняў, даручана да 15 снежня 1986 г. асабіста праверыць стан уліку, эксплуатацыі, арганізацыі прафілактычнага і бягучага рамонту каштоўнага абсталявання, а таксама метралагічны стан рабочых сродкаў вымярэнняў і прадставіць у камісію аб'ектыўную інфармацыю.

Дэкану фізічнага факультэта М. В. Максіменку і загадчыку ПНДЛ М. І. Ягоранкаву да канца бягучага года трэба правесці поўную рэвізію невыкарыстоўваемага абсталявання і прыняць меры па яго тэрміновому ўводу ў эксплуатацыю, а таксама па спісанню маральна і фізічна ўстарэлага.

Ад загадчыка кафедры агульнай фізікі Д. Р. Ліна запатрабавана прыняць неадкладныя меры па арганізацыі рамонту няспраўнага абсталявання і ўводу іх у эксплуатацыю да 30 снежня 1986 г.

За скажэнне інфармацыі аб стане выкарыстання каштоўнага абсталявання і рабочых сродкаў вымярэнняў загадчыку ПНДЛ М. І. Ягоранкаву, загадчыку лабараторыямі кафедры агульнай фізікі М. Л. Бурыкіну аб'яўлены строгія вымовы, загадчыку названай кафедры Д. Р. Ліну — вымова, ст. інжынеру ПНДЛ П. В. Атрошчанку — заўвага. За непрыняцце мер па своечасоваму ўводу ў эксплуатацыю установак ЦКБ-50 і ўтойванне сапраўднага тэхнічнага стану пры атрыманні іх з ГПІ дацэнту У. М. Старыкаву аб'яўлена строгая вымова.

Прынятыя адміністрацыйныя меры ўздзеяння да названых адказных асоб павінны паслужыць урокам не толькі для іх, але і для кожнага, хто нясе адказнасць за стан матэрыяльна-тэхнічнай базы сваіх падраздзяленняў.

**М. ТВАРДОЎСКІ,**
**загадчык НДС, намеснік старшыні пастаяннай камісіі па кантролю за рацыянальным выкарыстаннем каштоўнага абсталявання.**

*Госці студэнтаў — ветэраны*

# УРОКІ МУЖНАСЦІ

**Урачыста адзначылі жыхары абласнога цэнтра 43-ю гадавіну з дня вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А напярэдадні гэтай даты адбыліся ўрокі мужнасці ў народным універсітэце ваенна-патрыятычнага выхавання ГДУ. Да студэнтаў эканамічнага факультэта прыйшлі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, каб падзяліцца з моладдзю сваімі ўспамінамі, яшчэ раз ажывіць памяць аб тых цяжкіх гадах, у якіх праявіліся мужнасць і стойкасць савецкага народа.**

Усхваляваны расказ Івана Васільевіча Яромы перанёс нас у тыя страшныя дні пачатку вайны, калі фашысты ступілі на беларускую зямлю. Налёты варожых самалётаў станавіліся ўсё больш частымі. Але жыхары Гомеля рыхтавалі родны горад да абароны. На 28 км працягнуўся супрацьтанкавы роў, было выкапана шмат кіламетраў траншэй, пабудаваны дзоты. Хутка пераходзілі на выпуск ваеннай прадукцыі заводы і фабрыкі. На іх выраблялiся міны і мінамёты, рамантавалася ваенная тэхніка. У пачатку жніўня 1941 г. па рашэнню абкома партыі быў створан полк народнага апалчэння, у радах якога налічвалася 2200 байцоў. Гераічнае супраціўленне і мужнасць гамяльчан абышліся нямецкім акупантам стратамі шматлікай тэхнікі, авіяцыі, жывой сілы. Ствараліся падпольныя камсамольскія атрады, узнік атрад «Бальшавік», у які ўвайшлі кіраўнікі абкома і гаркома партыі.

Дзяліўся сваімі ўспамінамі і М. І. Рабенькі. Ён прымаў удзел у абароне Масквы, Тулы, камандаваў батарэяй пад Сталінградам. «Вялікія ахвяры панёс беларускі народ, — сказаў ветэран. — Шматпакутная Беларусь страціла сотні тысяч сваіх сыноў і дачок. Але загартаваная ў суровых выпрабаваннях Чырвоная Армія перайшла ў рашучае наступленне. А дзень 26 кастрычніка 1943 года стаў назаўсёды памятным для гамяльчан — 11-я армія пад камандаваннем генерала арміі І. І. Фядзюнінскага вызваліла горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

«Горад ляжаў у руінах, — расказаў А. Ф. Парошын,— але гамяльчане адразу ж узяліся за яго аднаўленне. Паўгалодныя, знясіленыя людзі будавалі Гомель па цаглінах, узнімалі сцены і карпусы заводаў і фабрык».

Цяпер Гомель — адзін з прыгажэйшых гарадоў рэспублікі. І мы, маладое пакаленне, не маем права забываць аб суровых днях Вялікай Айчыннай вайны, аб тым горы, якое прынесла яна людзям. Мы абавязаны захаваць мір на нашай блакітнай планеце для сённяшняга пакалення і для тых, хто будзе жыць пасля нас.

**В. ТОЛКАЧ,**
**студэнтка І-га курса эканамічнага факультэта, член прэс-цэнтра.**

# АРХЕАЛАГІЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

На гісторыка-філалагічным факультэце адбылася канферэнцыя па выніках археалагічнай практыкі. У бягучым годзе студэнты-гісторыкі ўдзельнічалі ў правядзенні раскопак у двух месцах: на старажытным гарадзішчы г. Гомеля (у парку імя Луначарскага) і каля вёскі Пруднікі Віцебскай вобласці.

З паведамленнямі аб рабоце экспедыцый, з расказам аб побыце і адпачынку студэнтаў, кантактах з мясцовымі школьнікамі выступілі студэнты гр. Г-21 і Г-22 Аляксандр Куроўскі, Іна Сазон, Анжэліка Марэніна.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта М. Ф. Гуліцкі, загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі Р. Р. Лазько, куратар гр. Г-21 В. І. Сычоў.

**У. БАГАМОЛЬНІКАЎ,**
**асістэнт кафедры гісторыі СССР і БССР.**

**ВЕДЫ ЗАМАЦАВАЛА ПРАКТЫКА**



**У час педагагічнай практыкі ў СШ № 44 г. Гомеля пяцікурснікі гістфіла маглі атрымаць неабходную метадычную дапамогу ў настаўнікаў школы.**

**На здымку: студэнткі гр. БР-51 І. Старынская, Л. Балтоўская, С. Старавыбарная, А. Фокіна разам з завучам В. М. Лісоўскай (у цэнтры) ў метадычным кабінеце.**

Фота Л. Акінчыц.

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

**Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый і гутарак сярод студэнтаў у снежні 1986 года.**

**1. На карысць народа, у імя міру** (да вынікаў шостай сесіі Вярхоўнага Савета СССР адзінаццатага склікання).

Матэрыялы сесіі апублікаваны ў цэнтральным і рэспубліканскім друку. Гл. таксама перадавы артыкул у газеце «Правда» за 21 лістапада 1986 г.

**2. Дзяржпрыёмка: узмацніць барацьбу за высокую якасць прадукцыі** (у гутарцы прааналізаваць гатоўнасць свайго прадпрыемства да ўвядзення дзяржпрыёмкі, удзел калектыву, кожнага працаўніка ў барацьбе за павышэнне тэхнічнага ўзроўню выпускаемай прадукцыі, за здачу ўсіх вырабаў з першага прад'яўлення).

У аснову гутарак пакласці патрабаванні і ўстаноўкі, змешчаныя ў прамове М. С. Гарбачова на Нарадзе ў ЦК КПСС па пытаннях дзяржаўнай прыёмкі прадукцыі (гл. «Правду» за 16 лістапада г. г.). Гл. таксама «Экономическую газету» № 48. «Известия» за 23 лістапада г. г.

**3. Колькі зарабіў — столькі і атрымай** (аб увядзенні новых тарыфных ставак і акладаў у вытворчых галінах на аснове павелічэння заробленых самімі прадпрыемствамі і арганізацыямі сродкаў, поўнай рэалізацыі на практыцы прынцыпу самафінансавання і самаакупнасці затрат).

Матэрыял публікуе газета «Звязда». Гл. таксама інфармацыйны бюлетэнь «Аргументы и факты» № 48, «Экономическую газету» № 47, часопіс «Агитатор» № 21 за 1986 г., газету «Труд» за 22 лістапада г. г.

**4. Барацьбу за цвярозасць весці без паслабленняў** (прааналізаваць, што зроблена ў працоўным калектыве і па месцы пражывання для пераадолення п'янства і алкагалізму, усталявання цвярозага ўкладу жыцця).

Матэрыял публікуе газета «Звязда», гл. таксама часопіс «Агитатор» № 21 за 1986 г.

**5. Ваенна-прамысловы комплекс ЗША — альянс сіл авантурызму і агрэсіі** (аб злавесным саюзе фабрыкантаў смерці і імперыялістычнай дзяржаўнай улады, яго пастаянна ўзрастаючай пагрозе міру).

Рэкамендуецца выкарыстаць у палітінфармацыях і гутарках на гэту тэму матэрыялы, апублікаваныя ў спецвыпуску інфармацыйнага бюлетэня «Аргументы и факты» № 46—47 за 1986 г.

*НА ШЛЯХУ ПЕРАБУДОВЫ*

# З РАЗЛІКАМ НА САМАСТОЙНАСЦЬ

У шматлікіх дырэктыўных дакументах і рашэннях Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада пастаўлены задачы паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў для ўсіх галін народнай гаспадаркі і культуры, вызначаны месца і роля кожнага падраздялення ВНУ ў сістэме навучання і выхавання студэнтаў. Паспяховае іх ажыццяўленне залежыць ад многіх фактараў, у тым ліку і ад арганізацыі вучэбнага працэсу, пошуку новых, больш эфектыўных форм і метадаў навучання.

Важным этапам у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў з'яўляецца правільная арганізацыя самастойнай работы студэнтаў, актывізацыя тых педагагічных метадаў і прыёмаў, якія найлепш садзейнічаюць выпрацоўцы ў іх навыкаў самакантролю і самаарганізацыі, індывідуалізацыі ўсяго працэсу навучання.

У агульнай суме гэтых прыёмаў і метадаў важнае месца на гісторыка-філалагічным факультэце займае актыўнае далучэнне студэнтаў да самастойнай творчасці, самастойнае авалоданне імі навыкамі вучэбна-метадычнай работы, уменне прымяняць атрыманыя веды на практыцы. Правільнасць такога кірунку пацвердзіла арганізаваная на факультэце 15—17 лістапада выстаўка дапаможнікаў, табліц, ілюстрацый, альбомаў, фотамантажу, літаратурных плакатаў, партрэтаў і іншых сродкаў нагляднасці, падрыхтаваных студэнтамі IV курсаў. Увесь гэты цікавы і шматгранны матэрыял, які дэманстраваўся на выстаўцы, практычна выкарыстоўваецца выкладчыкамі ўсіх кафедр факультэта з улікам канкрэтных умоў, задач і спецыфікі кожнай вучэбнай дысцыпліны.

Надзвычай багатай і цікавай аказалася экспазіцыя кафедры беларускай мовы. Яна была прадстаўлена разнастайнымі табліцамі па ўсіх курсах граматыкі, гісторыі беларускай літаратурнай мовы, лацінскай мове, альбомамі па матэрыялах дыялекталагічнай практыкі, дыдактычнымі матэрыяламі па курсу методыкі выкладання мовы. Актыўны ўдзел у яе падрыхтоўцы прынялі ўсе выкладчыкі кафедры. Асаблівую цікавасць у наведвальнікаў выстаўкі выклікалі матэрыялы дыялекталагічнай практыкі, падрыхтаваныя студэнтамі (выкл. Гуліцкая В. А.), дыдактычны матэрыял, аформлены студэнтамі V курса і апрабіраваны імі ў час правядзення педагагічнай практыкі ў школе (выкл. Ляшчынская В. А.). Гэтыя матэрыялы надзвычай зручныя для выкарыстання. Эфектыўнасць іх забяспечваецца тым, што яны падрыхтаваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбнай праграмы па дысцыплінах кафедры і пэўных тэмах курсаў. Галоўнае, як нам здаецца, у гэтай рабоце тое, што студэнты, пачынаючы з I курса, вучацца працаваць самастойна, успрымаюць такія індывідуальныя творчыя заданні з вялікай ахвотай, а таму рыхтуюцца да іх выканання сур'ёзна, уносяць у іх элементы навізны, творчасці, студэнцкай індывідуальнасці.

Парадавала наведвальнікаў выстаўкі багатая і разнастайная экспазіцыя кафедры беларускай літаратуры, на якой быў прадстаўлены наглядны матэрыял па старажытнай беларускай літаратуры, методыцы выкладання літаратуры, літаратуры народаў СССР, спецсемінары «Гомельшчына літаратурная». Частка з прапанаваных матэрыялаў, як скажам, карта «Гомельшчына літаратурная», выкарыстоўваецца на ўсіх занятках спецсемінара (выкл. Генаш В. С.) або на працягу ўсяго перыяду вывучэння творчасці пэўнага пісьменніка (літаратурныя альбомы па творчасці народных пісьменнікаў Беларусі, па творчасці лаўрэатаў Ленінскай прэміі ў літаратурах народаў СССР, па творчасці пісьменнікаў Гомельшчыны і г. д.). Усяго на выстаўцы было прадстаўлена больш за 50 такіх альбомаў. Сярод сродкаў нагляднасці экспанаваліся партрэты пісьменнікаў, ілюстрацыі да іх твораў, графічныя схемы і табліцы, матэрыял, які паспяхова выкарыстоўваецца як на лекцыях, так і на практычных, лабараторных занятках. Бясспрэчна, рыхтуючы такія матэрыялы, студэнты далучаюцца да самастойнага творчага пошуку, выпрацоўваюць навыкі работы з літаратурнымі першакрыніцамі, літаратурна-крытычнымі артыкуламі, манаграфіямі, навуковымі біяграфіямі пісьменнікаў, дакументальнымі матэрыяламі і г. д.

Усё гэта спрыяе прафесіянальнай арыентацыі студэнтаў, выхаванню любві да прадмета, агульнай эстэтычнай культуры, эмацыянальнага ўспрымання літаратуры як мастацтва слова.

Разнастайныя дыдактычныя і раздатачныя матэрыялы, табліцы, перфакарты па вывучэнню асобных часцін мовы, алгарытм па асноўных пытаннях арфаграфіі, якія выкарыстоўваюцца выкладчыкамі ў вучэбным працэсе, прадставіла на выстаўку кафедра рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства. У якасці першачарговай задачы па актывізацыі самастойнай работы студэнтаў-філолагаў кафедра вылучыла авалоданне студэнтамі навыкамі лінгвістычнага аналізу, нормамі правапісу, культурай вуснай і пісьмовай мовы. Наглядны матэрыял, падрыхтаваны сіламі студэнтаў, які дэманстраваўся на выстаўцы, сведчыў аб прадуманасці і мэтанакіраванасці пошуку выкладчыкаў кафедры па ўдасканаленню форм і метадаў індывідуальнай работы са студэнтамі.

Важным этапам дзейнасці студэнтаў-гісторыкаў з'яўляецца выпрацоўка ў іх навыкаў саманавучання і самаарганізацыі. метадычнае кіраўніцтва якой ажыццяўляюць гістарычныя кафедры. Наглядны матэрыял. прадстаўлены гэтымі кафедрамі. хаця і не адрозніваўся такой шматграннасцю і разнастайнасцю. як на папярэдніх кафедрах. усё ж сведчыў аб тым. што, рыхтуючы табліцы. карты па адпаведнай гістарычнай тэме студэнты самастойна здабывалі веды, асэнсоўвалі фактычны матэрыял.

Кафедра рускай літаратуры прадставіла наглядны матэрыял па найбольш складаных тэмах курса зарубежнай літаратуры (выкл. Емяльянава С. П.).

Запісы, зробленыя ў кнізе наведвальнікаў, сведчаць аб тым, што такія выстаўкі надзвычай карысныя і плённыя не толькі ў плане вучэбным, але і пазнаваўча-выхаваўчым. Студэнт-біёлаг гр. Б-32, напрыклад, піша аб тым, што выстаўка зрабіла на яго вялікае ўражанне: «Як кажуць, лепш раз убачыць, чым сто разоў пачуць... Далейшых поспехаў у рабоце, новых пачынанняў усім тым, хто творыць у вялікай і адказнай справе — выхаванні маладых людзей».

Бясспрэчна, што сам падрыхтоўчы этап да такой работы, методыка арганізацыі студэнтаў, патрабуюць ад выкладчыка большага індывідуальнага майстэрства, чым правядзенне звычайных заняткаў або калоквіумаў, праверкі пісьмовых рэфератаў і г. д. Падрыхтоўка гэтая звязана з глыбокім аналізам матэрыялаў, вылучэннем у ім тых момантаў, якія могуць і павінны быць прадстаўлены ў форме праблемных заданняў, і, па-другое, з абдумваннем самой формы іх выканання. Мы не хочам сказаць, што самастойная работа студэнтаў сёння павінна ажыццяўляцца толькі шляхам падрыхтоўкі розных форм нагляднасці для вучэбных заняткаў. Неабходны і кансультацыі, і навуковыя даклады, і рэфераты, трэніровачныя практыкаванні і г. д. Аднак менавіта толькі творчая дзейнасць студэнтаў, творчыя формы і прыёмы работы, пры якіх няма і не можа быць гатовых узораў і гатовых адказаў, павінны сёння стаць галоўным ва ўсёй нашай рабоце па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў. Інакш кажучы, індывідуалізацыя працэсу навучання, павышэнне ўдзельнай вагі самастойнай творчай дзейнасці студэнтаў становіцца своеасаблівым сувязным звяном паміж іх тэарэтычнай падрыхтоўкай і будучай самастойнай работай.

**В. СМЫКОЎСКАЯ,**
**старшыня метадычнай камісіі гісторыка-філалагічнага факультэта.**



На здымку: выстаўка метадычнай літаратуры выклікала вялікую цікавасць у яе наведвальнікаў.

# ВЫКЛАДАННЮ — ТВОРЧЫ ПАДЫХОД

У праекце Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай школы веданне замежнай мовы вызначаецца як абавязковы кампанент сучаснай вышэйшай адукацыі. Выкладчыкі кафедры нямецкай і французскай моў шукаюць шляхі актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, павышэння эфектыўнасці іх аўдыторнай і самастойнай работы. Натуральна, што сёння актывізацыя методыкі навучання павінна абапірацца на вялікія магчымасці тэхнічных сродкаў навучання.

У гэтым навучальным годзе наша кафедра атрымала лінгафонны кабінет тыпу «Эльфа». Работа ў ім садзейнічае індывідуалізацыі навучання, уліку здольнасцей і інтарэсаў студэнтаў. У кабінеце ёсць неабходная фанатэка, якая забяспечвае работу па асноўных тэмах праграмы, а таксама набор дыяфільмаў з метадычнымі ўказаннямі да іх. Студэнты з цікавасцю глядзяць наяўныя ў кабінеце фільмы на замежных мовах аб ГДР і Францыі.

На жаль, магчымасці выкарыстання ТСН абмежаваны корпусам № 1, дзе знаходзіцца лінгафонны кабінет.

Другім істотным фактарам актывізацыі метадычнай работы з'яўляецца вялікая магчымасць выкарыстання ў вучэбным працэсе навуковых часопісаў і газет ГДР. Выкладчыкі і лабаранты кафедры рэгулярна прагладаюць, адбіраюць, класіфіцыруюць і метадычна апрацоўваюць неабходныя матэрыялы з выданняў ГДР і айчыннай прэсы на замежнай мове. Для студэнтаў чытанне гэтых актуальных матэрыялаў з ілюстрацыямі ўяўляе значна большую цікавасць, чым работа з дапаможнікамі, якія хутка старэюць.

Матэрыялы, якія маюць асаблівую каштоўнасць, афармляюцца ў выглядзе набору тэматычна аднародных тэкстаў з каляровымі ілюстрацыямі да іх, складваюцца ў папкі і захоўваюцца ў спецыяльных шафах. Натуральна, што такія папкі з наборамі матэрыялаў існуюць для малодшых і старэйшых курсаў у залежнасці ад складанасці матэрыялу. Такіх папак на кафедры ўжо 175. Імі лёгка і зручна карыстацца, таму што яны дакладна раскласіфіцыраваны і пранумараваны.

Шмат каштоўных ілюстраваных матэрыялаў сабрана і выкарыстоўваецца выкладчыкамі па тэмах: «Жыццё і дзейнасць К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна», «Наша Радзіма», «XXVII з'езд КПСС», «Барацьба за мір», «Становішча працоўных у капіталістычных краінах», «Беларуская ССР», «Жыццё студэнтаў у краінах сацыялізму і краінах капіталізму», «Змагары-рэвалюцыянеры ў гісторыі нямецкага рабочага руху», «Нямецкія антыфашысты», «Школа», «Мая будучая прафесія — настаўнік», «ГДР», «Вялікія вучоныя» і інш. Падбіраецца матэрыял на замежных мовах для антыалкагольнага выхавання.

У адпаведнасці са спецыялізацыяй студэнтаў на кафедры ёсць ілюстраваныя матэрыялы па тэматыцы вывучаемых імі курсаў. Найбольшая колькасць такіх матэрыялаў сабрана для будучых гісторыкаў, выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры, біёлагаў.

Шкада, што з-за адсутнасці месца захоўвання мы не можам стварыць граматычныя табліцы. Выйсцем з такога становішча з'яўляецца фатаграфаванне табліц на плёнку з далейшай дэманстрацыяй у аўдыторыі, што і прадугледжваем рабіць.

**В. РАБЕНКА,**
**загадчык кафедры нямецкай і французскай моў, дацэнт.**

# МЭТА — НАКІРАВАНА

Пэўны вопыт выкарыстання тэхнічных сродкаў навучання ёсць на кафедры англійскай мовы. Цяпер мы маем метадычныя рэкамендацыі па рабоце з фоназапісамі, эпіфільмамі, дыяфільмамі, кінакальцоўкамі і кінафрагментамі. Усе гэтыя матэрыялы аказваюць неацэнную дапамогу пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў.

Нашымі выкладчыкамі асабліва шырока выкарыстоўваюцца фоназапісы. У кожным вучэбным корпусе ўстаноўлен магнітафон, што дазваляе выкарыстоўваць яго на ўсіх занятках. У вучэбны працэс уключаюцца спецыяльныя тэксты для аўдыравання, практыкаванні для выпрацоўкі тэхнікі чытання і вымаўлення. На кафедры створана фанатэка, якая складаецца ў асноўным з запісаў вучэбных тэкстаў, лабараторных работ для адпрацоўкі тэхнікі чытання, а таксама серыі лабараторных работ па аўдыраванню, заснаваных на змесце вусных экзаменацыйных тэм. У распараджэнні нашых выкладчыкаў і дыятэка, дзе вялікі выбар дыяфільмаў па розных тэмах як размоўных, так і краіназнаўчых. Паколькі большасць дыяфільмаў суправаджаецца рускім тэкстам, выкладчыкі кафедры правялі вялікую работу па складанню да іх англійскіх тэкстаў. Усе яны запісаны на магнітную плёнку і служаць гукавым суправаджэннем пры паказе дыяфільмаў.

На пачатковым этапе навучання дыяфільмы выкарыстоўваюцца для сітуацыйных уводзін лексікі, арганізацыі парнай работы па пытальна-адказнай сістэме. Ёсць на кафедры і некалькі кінафільмаў, але іх яўна не хапае.

У цяперашні час ва ўсе сферы жыцця шырока ўваходзіць відыётэхніка, якая дае вялікія магчымасці для ўдасканальвання вучэбнага працэсу. Аднак адзіны відыёмагнітафон, які ёсць у нашым распараджэнні, сапсаваны і няма ўпэўненасці ў тым, што ў бліжэйшы час яго адрамантуюць. Існуюць пэўныя цяжкасці таксама ў набыцці кінафільмаў і дыяфільмаў. Усё гэта ў значнай ступені ўскладняе нашу работу.

Цяпер асабліва шмат ідзе размоў аб арганізацыі самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў. У вырашэнні гэтай задачы вельмі карыснымі з'яўляюцца лабараторныя работы, разлічаныя на выкарыстанне гукавых ТСН і прадугледжаныя для самастойнай працы ў фоналабараторыі. Пры ўмелай арганізацыі лабараторныя заняткі забяспечваюць высокі ўзровень матывацыі навучання і павышаюць эфектыўнасць пазаўрочных самастойных заняткаў. На нашай кафедры створана серыя з 30 лабараторных работ да вусных тэм. Цяпер распрацоўваюцца аналагічныя лабараторныя работы для пачынаючых вывучаць англійскую мову. Усе гэтыя работы забяспечаны графічнымі або гукавымі ключамі, што дазваляе ажыццяўляць самакантроль і самакарэкцыю.

У распараджэнні кафедры ёсць кабінет англійскай мовы, аснашчаны лінгафонным прыстасаваннем аўдыяактыўнага тыпу, праекцыйнай апаратурай і сродкамі экспаніравання вучэбна-наглядных дапаможнікаў. Магчымасці гэтага комплексу — вялікія. Адначасовае выкананне розных праграм дазваляе ажыццяўляць дыферэнцыраваны падыход у навучанні, вырашаць пытанне аптымізацыі вучэбнага працэсу. Але, на жаль, у гэтым кабінеце маюць магчымасць займацца сістэматычна толькі студэнты гісторыка-філалагічнага і біялагічнага факультэтаў. Для ўсіх астатніх такія заняткі—рэдкасць. Было б мэтазгодна мець такі лінгафонны кабінет у кожным вучэбным корпусе.

Адначасова з гука-тэхнічнымі сродкамі выкладчыкі нашай кафедры выкарыстоўваюць традыцыйныя наглядныя сродкі. У папярэднім навучальным годзе створаны тэматычныя стэнды і альбомы. Яны забяспечаны багатым ілюстрацыйным матэрыялам, схемамі і дыяграмамі. Гэта дапамагае выкарыстоўваць іх для развіцця навыкаў вуснай мовы. Вялікую дапамогу ў навучанні студэнтаў граматыцы аказваюць граматычныя табліцы, якія зроблены нашымі выкладчыкамі. Сёлета ратапрынтным спосабам выдадзены метадычныя дапаможнікі.

**Т. СУРМЯНКОВА,**
**выкладчыца кафедры англійскай мовы.**

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

# «НЕ ЗНАЙСЦІ КАНЦОЎ»

Рэпліка пад такім загалоўкам была змешчана ў папярэднім нумары нашай газеты. Дацэнт В. М. Кучмін пісаў аб тым, што са склада універсітэта кімсьці атрымана дакументацыя, прызначаная для кафедры АМАЭІ.

Як паведамў рэдакцыі начальнік матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння А. М. Валасенка, такі факт сапраўды меў месца. Работнікам склада ўказана на паляпшэнне ўліку атрымання і выдачы матэрыяльных каштоўнасцей, у тым ліку бланачнай і тэхнічнай дакументацыі. Ад іх было запатрабавана адшукаць выдадзеную не па адрасу дакументацыю. Яна была знойдзена.

Разам з тым А. М. Валасенка зазначыў, што ва ўсіх падраздзяленнях пры афармленні заказаў павінны строга кіравацца загадам па універсітэту ад 28 кастрычніка 1983 года «Аб парадку набыцця, уліку, захавання, выкарыстання і спісання навукова- і вучэбнага абсталявання». У гэтым загадзе ўказана, што пры заказах на абсталяванне і іншыя матэрыяльныя каштоўнасці неабходна запаўняць службовую запіску і візіраваць яе ў начальніка аддзела МТЗ. Аб чаканым паступленні заказа трэба своечасова інфарміраваць работнікаў склада, што не было зроблена ў даным выпадку. І гэта не адзінкавы прыклад. У прыватнасці, сёння на складзе знаходзяцца матэрыяльныя каштоўнасці, паступіўшыя з Калінінграда, Масквы, Віцебска і Мінска. А заказчыкі іх невядомыя.

НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

# ДВУХТОМНІКІ ПАЭЗІІ І ПРОЗЫ

У нашым магазіне ёсць у продажы выбраныя творы ў 2-х тамах беларускіх паэтаў і празаікаў, а таксама братняй Латвіі. Прапануем набыць кнігі аматарам паэзіі і прозы.

**КРАПІВА К.** Выбраныя творы ў 2-х тамах.

Двухтомнік склалі лепшыя творы класіка беларускай савецкай літаратуры, народнага пісьменніка БССР, акадэміка, Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР Кандрата Крапівы.

Гераізму савецкіх людзей у вайну і ў мірны час прысвечаны драмы «Канец дружбы», «Партызаны», «Проба агнём», «З народам», «Пяюць жаваранкі». У сатырычных камедыях «Хто смяецца апошнім», «Мілы чалавек», «Людзі і д'яблы», «Брама неўміручасці» аўтар выкрывае бюракратаў, дармаедаў, кар'ерыстаў, розных прыстасаванцаў.

У паэмах «Біблія», «Хвядос — Чырвоны нос» выкрываюцца злачынныя планы імперыялістаў, а таксама ўнутраныя шкоднікі сацыялістычнага ладу.

**ГРАХОЎСКІ С.** Выбраныя творы ў 2-х тамах.

Першы том вядомага беларускага паэта склалі вершы 1929—1977 гадоў. У іх аляваецца прыгажосць роднаг краю, рамантыка дарог, каханне, баявыя і працоўныя подзвігі савецкіх людзей.

У другі — ўвайшлі вершы, напісаныя ў 1977—81 гг., паэмы «Памяць», «Тры вымярэнні», «Спаленыя масты» і іншыя, а таксама паэтычныя пераклады.

**ВЯЛЮГІН А.** Выбраныя творы ў 2-х тамах.

Вершы, балады, паэмы Анатоля Вялюгіна, а таксама паэмы сяброў у ягоным перакладзе, эсэ, партрэты таварышаў, кінасцэнарыі ўвайшлі ў двухтомнік.

**ЛАТЫШСКАЯ САВЕЦКАЯ ПАЭЗІЯ.** Анталогія ў 2-х тамах.

Анталогія латышскай савецкай паэзіі знаёміць беларускага чытача з лепшымі ўзорамі прыгожага пісьменства братняга суседняга народа.

**М. ДЗЯТЛАВА,**
**прадавец кніжнага магазіна № 19.**

СПОРТ

## «МІЖНАРОДНЫЯ» МАТЧЫ

Вялікую цікавасць у шматлікіх балельшчыкаў выклікала сустрэча па міні-футболу, якая адбылася на мінулым тыдні ў спартыўнай зале вучэбнага корпуса № 1. На «поле» выйшлі зборныя каманды выкладчыкаў матэматычнага факультэта і замежных студэнтаў-матэматыкаў. Гульня праходзіла ў карэктнай, дружалюбнай атмасферы. Спачатку двойчы дабіліся поспеху выкладчыкі. Але паступова ініцыятыву захапілі замежныя студэнты і здолелі закончыць сустрэчу на сваю карысць. Яны перамаглі з лікам 5:4. Асабліва вызначыліся Шіані Сако, Керфала Камара (Гвінейская Рэспубліка), Ралан Кундэ, Нікала Нунахон (Народная Рэспубліка Бенін).

У матчы-рэваншы, якія адбыўся днямі, перамогу атрымала каманда выкладчыкаў.

**У. КОВАЛЬ,**
**намеснік дэкана па рабоце з замежнымі навучэнцамі.**



**На здымку: капітаны каманд Ралан Кундэ і нам. дэкана матфака М. В. Селькін.**
**Фота У. Чысціка.**

## ПА ПРАГРАМЕ УНІВЕРСІЯДЫ

Закончыліся спаборніцтвы па міні-футболу, якія ўваходзяць у праграму круглагадовай універсіяды. Большасць паядынкаў вызначаліся ўпартай барацьбой. Асабліва напружаным быў матч паміж камандамі эканамістаў і фізікаў.

Пераможцамі турніру сталі футбалісты факультэта фізвыхавання. Другое месца дасталося будучым эканамістам, трэцяе — матэматыкам. Наступныя радкі ў турнірнай табліцы занялі адпаведна каманды фізічнага, геалагічнага, гісторыка-філалагічнага і біялагічнага факультэтаў.

**В. АСТАХАЎ,**
**суддзя спаборніцтваў.**

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**Дырэкцыя гарадскога спорткомплексу (вул. Партовая, 6) запрашае супрацоўнікаў і студэнтаў ГДУ на заняткі ў абанементныя групы плавання.**

**Час заняткаў — штодзённа з 18.30 да 19.15. Тэлефон для даведак — 55-12-43.**

## ПЕРШАЯ ЧЭМПІЁНКА

Барацьба дзюдо сярод жанчын — параўнальна малады від спорту ў Беларусі. Толькі ў мінулым годзе ён быў уключаны ў праграму Спартакіяды ВНУ рэспублікі. Робіць свае першыя крокі жаночае дзюдо і на Гомельшчыне.

**Нядаўна ў гомельскім Палацы спорту «Спартак адбылося першынство абласнога савета** ДСТ прафсаюзаў па барацьбе дзюдо сярод жанчын. У ім прымалі ўдзел каманды вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў горада і вобласці — ГДУ, політэхнічнага, Мазырскага педагагічнага інстытутаў, аб'яднання «Гомсельмаш» і інш.

Лепшых вынікаў на спаборніцтвах дасягнула другакурсніца фізічнага факультэта нашага універсітэта Таццяна Чубукова, якая выступала ў вагавай катэгорыі да 66 кг. Яна стала чэмпіёнкай вобласці.

Варта адзначыць, што дзяўчына займаецца гэтым відам спорту толькі тры месяцы. На думку ж вопытных трэнераў, каб дасягнуць такога высокага выніку як у Таццяны, патрабуецца не менш года.

**(Наш кар.).**

## ВАШ АДПАЧЫНАК

**Сёння і заўтра: «Дні эканаміста». Актавая зала.**

**29-га: прэс-канферэнцыя выкладчыкаў і студэнтаў. Пачатак у 12.30.**

**18 гадзін — канцэрт мастацкай самадзейнасці, 19.30 — танцавальная праграма, 20.30 — вечар адпачынку ў інтэрнаце № 4.**

**30-га: актавая зала. 13 гадзін — дэманстрацыя мод. 19.00 — Клуб вясёлых і знаходлівых «Дацэнты—студэнты». Пасля заканчэння — танцавальная праграма.**

**29-га: трэніровачныя заняткі па вольнай, класічнай барацьбе, кулявой стральбе. З 14 да 18 гадзін. Спартыўная зала корпуса № 1. З 18 да 20 гадзін — работа секцыі па ручному мячу падшэфных домакіраўніцтваў.**

**30-га: з 10 да 13.30 — масавыя спартыўныя спаборніцтвы на факультэце фізвыхавання. З 14 да 16 гадзін — заняткі сямейнага спартклуба. З 18 да 20.30 — спаборніцтвы груп «Здароўе» па валейболу.**

**НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ**

**4-га снежня. Актавая зала. Канцэрт артыста эстрады А. Марусева. Пачатак у 19.30.**

**ШТАБ ВЫХАДНОГА ДНЯ,**
**СПАРТКЛУБ.**

*Асновы здаровага ладу жыцця студэнтаў*

# СОН І ПРАЦАЗДОЛЬНАСЦЬ

## З ВАМІ ГУТАРЫЦЬ УРАЧ

Паўнацэнны сон у значнай ступені забяспечвае нармальнае самаадчуванне чалавека. У працэсе сну ўзнаўляюцца энергетычныя запасы, якія страціліся ў час работы, нярвовая тканка вызваляецца ад накапіўшыхся ў ёй прадуктаў распаду.

Недахоп сну шкодна адбіваецца на здароўі. Вядома, што ў працэсе начнога сну час ад часу ўзнікае актыўны стан мозгу, як пры напружанай працы. Адначасова адзначаюцца хуткія варочанні вочных яблык, рух цела — у такія перыяды чалавеку сняцца сны. Гэтая фаза сну атрымала некалькі назваў: хуткі сон і рэма-сон.

Другую фазу назвалі павольным сном. У час яго памяншаецца частата дыхання і сардэчных скарачэнняў, выдзяленне некаторых гармонаў, зніжаецца тэмпература цела, актыўнасць работы страўнікава-кішэчнага тракту. У гэтым выпадку чалавеку сны не сняцца.

У фазе хуткага сну ў арганізме адбываюцца глыбокія змены. Пачашчаюцца рытмы дыхання і работы сэрца, павышаецца артэрыяльны ціск, узмацняюцца мазгавы кровазварот і гарманальная дзейнасць. Аднačасова фіксіруецца глыбокае расслабленне мышцаў твару, мозг вызваляецца ад залішняй інфармацыі. Пазбаўленне чалавека гэтай фазы сну рэзка зніжае яго разумовую працаздольнасць, прыводзіць да значных псіхічных змен, пагаршэння самаадчування. Значыць, для людзей з павышанай трывожнасцю (а такі стан асабліва ўласцівы студэнтам) хуткі сон асабліва неабходны.

Начны сон складаецца з 4—5 цыклаў працягласцю 90—100 мінут. У кожным з іх выдзяляюцца фаза дрымоты, або паверхневага сну, і фаза сярэдняга сну, калі любы шум можа нас разбудзіць. Затым ідуць фазы павольнага і хуткага сну.

Асаблівае значэнне паўнацэнны сон набывае ў перыяд сесіі, калі студэнтам даводзіцца засвойваць шмат інфармацыі. Менавіта тады студэнт павінен спаць не менш 8 гадзін. Калі ж сон працягваецца толькі 5—6 гадзін, зніжаецца працаздольнасць, пагаршаецца засваенне матэрыялу і наогул арганізм становіцца слабейшым. Кожны студэнт павінен памятаць, што напружаную разумовую працу неабходна заканчваць за 1,5—2 гадзіны да начнога сну.

Перад сном неабходна абавязкова праветрыць пакой, стварыць цішыню і выключыць крыніцы яркага святла. На жаль, пасля 24 гадзін у інтэрнаце бывае нярэдка ажыўлена: вядуцца гучныя размовы, чуецца музыка і г. д.

Вельмі карысны непрацяглы дзённы пасіўны адпачынак. Гарызантальнае становішча цела паляпшае мазгавы кровазварот, расслабляе мышцы. Дзённы сон, нават кароткачасовы, цудоўна аднаўляе працаздольнасць.

У студэнцкім інтэрнаце неабходна стварыць усе ўмовы для паўнацэннага начнога адпачынку ўсіх яго жыхароў.

**Л. ХАРУНЖАЯ,**
**урач-тэрапеўт паліклінікі № 6, член Таварыства Чырвонага Крыжа.**

## ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА

**У прафкоме ёсць турыстычныя пуцёўкі на спецрэйс поезда па маршруту Гомель — Кішынёў — Адэса — Гомель. Паездка прадугледжана на 12—15 снежня 1986 г. Кошт пуцёўкі — 61 рубель. Палавіну ўказанай сумы аплачвае прафсаюзны камітэт.**

**Жадаючыя адправіцца ў цікавае падарожжа могуць звярнуцца за даведкамі ў прафком.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

АЗ. 13546

Заказ 819